Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-08-30

# Падарожжа праз эпохі




Не будзе перабольшваннем сказаць, што сапраўдная вядомасць прыйшла да Івана Саверчанкі на пачатку 1990-х гадоў. Тады ў маладога супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі выйшла адразу некалькі навукова-папулярных выданняў: «Астафій Валовіч», «Канцлер Вялікага Княства», прысвечанае Льву Сапегу, «Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар», «Апостал яднання і веры» (пра Язэпа Руцкага). Але пакрысе даследчык стаў надаваць усё большую ўвагу акадэмічнай навуцы. Ён абараніў доктарскую дысертацыю па філалогіі, з'яўляецца аўтарам больш як 250 публікацый, сярод якіх 7 манаграфій. Апошняй з іх стала «Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI — XVII стагоддзяў».

Аўтар 463-старонкавага фаліянта пераносіць чытачоў у часы Рэнесансу і Барока, якія з'яўляліся апагеем у развіцці даўняй беларускай культуры і літаратуры. Менавіта тады на авансцэну нацыянальнага прыгожага пісьменства выйшлі Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іпацій Пацей, Мялецій Сматрыцкі і іншыя інтэлектуалы свайго часу, якія працавалі ў розных ідэйна-эстэтычных напрамках і пісалі на царкоўнаславянскай, старабеларускай, польскай і лацінскай мовах. Як тлумачыць аўтар у прадмове, «нацыянальнай літаратуры XVI — XVII стст. быў уласцівы сінкрэтызм, энцыклапедычнасць і анталагізм. Пісьменнікі імкнуліся адказаць літаральна на ўсе пытанні быцця, задаволіць духоўныя і пазнавальныя патрэбы сучаснікаў». У сваім даследаванні І. Саверчанка раскрывае мастацка-эстэтычныя каштоўнасці шэдэўраў таго часу.

**Дзяніс МАРЦІНОВІЧ**

Дзяніс Марціновіч. Падарожжа праз эпохі